УДК 37(476)(091)“17”

# ПРАВАСЛАЎНАЯ АДУКАЦЫЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ТРЭЦЯЙ ЧВЭРЦІ XVIII ст.

**Самусік А. Ф.**
установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт”
(Мінск, Рэспубліка Беларусь)

Анатацыя. У артыкуле разгледжаны працэс стварэння новай мадэлі праваслаўнай адукацыі на тэрыторыі Беларусі ў трэцяй чвэрці XVIII ст. Адкрыццё ў азначаны час Магілёўскай семінарыі, Слуцкага калегіума і Пінскай манастырскай школы сведчыла аб яе пераходзе ад традыцый брацкай педагогікі да руска-ўкраінскіх стандартаў духоўнай асветы. Адзначаны кантакты айчынных праваслаўных школ з пратэстантамі і іх арыентацыя на падрыхтоўку выхаванцаў да паступлення ў Кіева-Магілянскую акадэмію.

Ключавыя словы: праваслаўная адукацыя, Магілёўская семінарыя, Г. Каніскі, Слуцкі калегіум, Д. Галяхоўскі, Пінская манастырская школа, Т. Яворскі.

Summary. The article considers the process of creating a new model of Orthodox education in Belarus in the third quarter of the XVIII century. The opening of the Mogilev Seminary, Slutsk Collegium and Pinsk Monastery School at the specified time testified to its transition from the traditions of fraternal pedagogy to the Russian-Ukrainian standards of spiritual enlightenment. The contacts of Russian Orthodox schools with Protestants and their orientation towards preparing pupils for admission to the Kyivo-Mohylanskaja Academy are noted.

Keywords: Orthodox education, Mogilev Seminary, G. Kaniski, Slutsk Collegium, D. Galyakhovsky, Pinsk Monastery School, T. Yavorsky.

У гісторыі айчыннай праваслаўнай адукацыі з сярэдзіны XVIII ст. пачаўся новы этап эвалюцыі. Традыцыі брацкай педагогікі тут ужо не ўлічваліся. Асветніцкая ініцыятыва зыходзіла выключна ад царкоўных іерархаў, якія разглядалі арганізаваныя імі навучальныя ўстановы ў якасці састаўных элементаў агульнай для ўсёй Рускай праваслаўнай царквы школьнай сістэмы. Пры гэтым, урэшце рэшт, спынілася практыка рэгулярнага “выпустошвання” інтэлектуальнай эліты Кіева-Магілянскай акадэміі і Кіева-Пячорскай лаўры на патрэбы Св. Сінода. У 1754 г. “в архиереи и архимандриты” па загаду імператрыцы Елізаветы павінны былі абірацца асобы “из Великороссиян непременно” [10, с. 71]. Гэта адразу ж адчула



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

на сабе і праваслаўная царква ў Беларусі, куды з Кіева сталі накіроўвацца добраадукаваныя асобы, прыклаўшыя значныя намаганні па адраджэнні тут адукацыйнай справы.

У 1755 г. магілёўскім епіскапам быў прызначаны рэктар Кіева-Магілянскай акадэміі Г. Каніскі, які адразу ж распачаў актыўную дзейнасць ва ўласнай епархіі. Адной з асноўных праблем ён лічыў нізкі ўзровень адукаванасці тутэйшага святарства. У рапарце ад 10 красавіка 1756 г. у Св. Сінод Г. Каніскі пісаў наступнае: "Для священнических и причетнических детей крайне нужно быть школе, в которой бы по последней мере обучать их на русском хотя языке закону Божию и членам веры. Також и писать, ибо многи из священников ни на русском, ни на польском языке писать не умеют, только одно свое собственное имя подписать, а потому и репортов от них також и записов метрических нет… а для острейших детей чтобы можно было и латинского языка содержать семинарию". Св. Сінод пайшоў яму насустрач і 31 студзеня 1757 г. звярнуўся да імператрыцы Елізаветы з просьбай зацвердзіць выдзяленне 400 руб. штогод для семінарыі ў Магілёўскай епархіі. 25 студзеня 1758 г. імператарскім указам грошы былі выдзелены, – на пастаяннай аснове яны паступалі "из Синодальных доходов" [10, с. 276-277, 315-316].

Г. Каніскі, не чакаючы дазволу рускіх улад на адкрыццё семінарыі, загадаў прыбыўшым разам з ім з Кіева студэнтам В. Садкоўскаму і Д. Чугаевічу: "Довольным к учительству семинарскому… единому Евангелие, другому катехизм в дни недельные в церкви изъяснять" [11, арк. 3]. У 1757 г. епіскап за кошт епархіі адкрыў у Спаскім манастыры Магілёва пачатковыя класы (заняткі адбываліся ў манаскай трапезнай). Пры гэтым выкладанне ў іх было даручана згаданым выхаванцам Кіева-Магілянскай акадэміі [3, с. 107-109].

Афіцыйна ж Магілёўская праваслаўная семінарыя распачала ўласную працу ў 1759 г. В. Садкоўскі стаў тутэйшым прэфектам, а рэктарам лічыўся сам Г. Каніскі. Адведзеныя Пецярбургам грошы на яе, аднак, былі яўна недастатковымі – аналагічныя духоўныя навучальныя ўстановы на тэрыторыі Расійскай імперыі мелі ў сярэднім штогод па 3 тыс. руб. З улікам недастатковага фінансавання Магілёўскай семінарыі цалкам верагодным выглядае аказанне ёй пэўнай дапамогі з боку Богаяўленскага брацтва, у прыходна-расходных рэестрах якога за 1759-1775 гг. сярод асноўных выдаткаў узгадваецца "содержание типографии и школы" [1, с. 232].

Вучэбная праграма прадугледжвала вывучэнне асноў праваслаўнага веравызнання, рускай, грэчаскай і лацінскай моў. Можна меркаваць, што семінарыстам чыталіся курсы арыфметыкі, храналогіі і прыродазнаўства, неабходныя для пашырэння іх адукаванасці. Наконт першых настаўнікаў Магілёўскай семінарыі вядома, што той жа В. Садкоўскі не толькі працаваў у ёй прэфектам, але і чытаў тут курс латыні, а таксама вёў царкоўныя службы [14, с. 80]. У сваю чаргу, Д. Чугаевіч, паводле ўспамінаў мясцовага чыноўніка Г. Дабрыніна, "знал хорошо латинский язык и латинских авторов, имел смысл чистой и речь порядочную" [6, с. 234]. Акрамя іх, у 1765-1769 гг. тут выкладаў І.І. Маркевіч, які быў "беспременно ж латинского языка, прежде инфимы, грамматики и синтаксими, а потом риторики учителем" [12, арк. 5, 7].

Г. Каніскі рабіў усё магчымае для падняцця аўтарытэта семінарыі ў святарства. Семінарысты мелі льготы пры атрыманні прыхода, бацькі за накіраванне сына ў семінарыю маглі быць пераведзены ў больш заможны прыход, прызнавалася права атрымання ў спадчыну семінарыстамі прыхода свайго бацькі. Такі падыход паступова пачаў даваць вынікі – усё часцей сяляне прасілі даць ім свяшчэнніка з семінарыі, якіх у народзе пачалі называць "вучонымі" [5, с. 178-179].

Абараніў правы Магілёўскай семінарыі "Вечны трактат", які быў заключаны 13 лютага 1768 г. У 12-м параграфе дадатковага Сепаратнага акта адзначалася: "Семинария Могилевская… не должны ни кем быть беспокоиваны" [9, с. 457]. У сваю чаргу, кароль Станіслаў Аўгуст у прывілеі ад 18 красавіка 1768 г. адзначаў: "Прасіў нас шаноўны Георгій Каніскі, праваслаўны Епіскап Беларускі, заяўляючы, што ён жадае вучылішча, у горадзе нашым Магілёве заснаванае для адукацыі юнацтва Рускага праваслаўнага народа ў вучэнні ўсходняй Грэчаскай набожнай веры, таксама ў мовах Лацінскай ды Грэчаскай і іншых навуках, прыстойных жыхарам гэтага краю – перанесці сваім утрыманнем на адасобленае, зручнае месца, менавіта на прадмесце да царквы св. Мікалая, і пры Семінарыі зладзіць друкарню... Мы Кароль, падтрымліваючы міласціва гэтае прашэнне, дазваляем перамясціць і выбудаваць на азначаным месцы, каля царквы св. Мікалая, драўлянае альбо каменнае вучылішча для адукацыі юнакоў…" [2, с. 143-144].

Разам з тым далейшага развіцця Магілёўская семінарыя ажно да першага падзелу Рэчы Паспалітай так і не атрымала. Адбылося гэта найперш з прычыны ад'езду Г. Каніскага ў Смаленск [16, с. 95]. А таксама таму, што згаданыя вышэй тутэйшыя настаўнікі – В. Садкоўскі і Д.Р. Чугаевіч – спынілі ў семінарыі сваю выкладчыцкую справу. Першы з іх яшчэ ў 1760-я гг. пастрыгся ў манахі, у 1768 г. стаў іераманахам, а ў 1772 г. заняў пасаду намесніка магілёўскай кафедры і члена духоўнай кансісторыі [15, с. 23-25]. Што ж датычыцца другога, то ён, па інфармацыі таго ж Г. Дабрыніна, "по присоединении Белорусского края к России вступил в статскую службу… помещён стряпчим в верхнюю расправу; потом в верхний земский суд" [6, с. 233].

Акрамя Магілёва, праваслаўны адукацыйны асяродак існаваў і ў Слуцку. У 1758 г. тутэйшым архімандрытам быў прызначаны Д. Галяхоўскі, які, прыбыўшы ў горад, знайшоў мясцовую праваслаўную абшчыну ў занядбаным становішчы. Для паляпшэння сітуацыі ім была адкрыта семінарыя пры Спаса-Праабражэнскім манастыры: "Для обучения детей, при латинских школах, священному писанию и всему для священства нужному". Дакладная дата яе заснавання невядома, але ў 1760 г. у Кіева-Магілянскую акадэмію паступіў Е. Гармакратны, які пры залічэнні адзначыў, што наведваў у Слуцку праваслаўную школу. Факт існавання семінарыі пацвярджае і ліст ад 27 красавіка 1761 г. Д. Галяхоўскага да рускага пасла ў Варшаве Ф.М. Ваейкава. У ім ён адзначаў яе запатрабаванасць у мясцовым грамадстве: "Я почал зде заводить семинарию: профессоров блахочестивых наших достал, и великое множество поповских детей, весьма к наукам способных, имеется, котории со временем народ зде благочестивый просвещать совершенно доволны будут" і прасіў дыпламата падтрымаць хадайніцтва ў Св. Сінод аб фінансаванні аналагічнага толькі што выдзеленага на Магілёўскую семінарыю. Колькасць выхаванцаў у Слуцку дасягала 70, але іх навучанне было прыпынена заўчаснай адстаўкай у 1763 г. Д. Галяхоўскага. Па словах замяніўшага яго П. Ваўчанскага, з былых выхаванцаў Слуцкай семінарыі "кто по домам, кто по разным местам разбрелися" [7, с. 135 ; 8, с. 1209-1210].

Аднаўленне навучальнай установы пачалося ў 1764 г. з дазволу мітрапаліта кіеўскага і галіцкага А. Магілянскага. Школа была пераведзена ў Троіцкі манастыр і перайменавана ў "калегіум". Апошні меркавалася паступова ўзняць да ўзроўню аднайменных украінскіх навучальных устаноў (Пераяслаў, Харкаў, Чарнігаў) і найперш рыхтаваць у ім юнакоў для прыняцця духоўнага звання. Разам з тым дасягнуць папярэдняга ўзроўню Слуцкі калегіум не здолеў. У 1768 г. П. Ваўчанскі паведамляў мітрапаліту, што ў мінулым годзе ў ім вучылася 15 юнакоў, а таксама мелася бурса для сірат і дзяцей са збяднелых сямей мясцовых святароў. Для пашырэння колькасці выхаванцаў архімандрыт з прычыны таго, што "сам он весьма занят", прасіў накіраваць у Слуцк на пасаду настаўніка з Вільны іерадыякана І. Статкевіча. Згода Кіева была атрымана, але ў далейшым Слуцкі калегіум усё ж з прычыны адсутнасці стабільнага фінансавання (Св. Сінод грошы на яго не выдзяляў) быў вымушаны працаваць у тандэме з мясцовай кальвінскай гімназіяй. Звычайна па заканчэнні навучання ў ім лепшыя праваслаўныя выхаванцы некалькі год вучыліся ў пратэстантаў, а потым адпраўляліся ў Кіева-Магілянскую акадэмію [4, с. 7 ; 13, с. 325].

Таксама вядома і пра яшчэ адзін праваслаўны асяродак асветы ў азначаны перыяд – пры Пінскім Богаяўленскім манастыры. Ігумен Т. Яворскі на мяжы 1750–1760-х гг. распачаў выкладанне польскай і царкоўнаславянскай моў дзецям 7–14-гадовага ўзросту з сямей святароў і мяшчан, што, акрамя агульнага павышэння адукаванасці мясцовага насельніцтва, давала магчымасць лепшым з мясцовых выхаванцаў таксама адправіцца ў Кіеў [17, с. 240-241].

У цэлым відавочна, што ў трэцяй чвэрці XVIII ст. на тэрыторыі Беларусі ўзнік цэлы шэраг новых цэнтраў праваслаўнай адукацыі. Іх галоўнай адметнасцю стала ігнараванне мясцовых педагагічных традыцый. Сярод прычын гэтага можна вылучыць



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

наступныя: па-першае, тутэйшыя брацкія школы зніклі задоўга да іх стварэння, а таму непасрэдная сувязь паміж імі праз настаўніцкія кадры, падручнікі ці нават асоб, якія вучыліся ў адной сістэме, а потым прыйшлі выкладаць у іншую, адсутнічала; па-другое, ініцыятары адраджэння праваслаўнай школьнай справы на тэрыторыі Беларусі не з'яўляліся мясцовымі ўраджэнцамі, а прыбывалі сюды з Кіева. У залежнасці ад сітуацыі яны тут ці капіравалі арганізацыю вучэбна-выхаваўчага працэсу адпаведна загадаў Св. Сінода (Магілёўская семінарыя), ці школьнай мадэлі, прынятай на Украіне (Слуцкі калегіум); па-трэцяе, кіраўніцтва Рускай праваслаўнай царквы імкнулася да ўніфікацыі духоўнай адукацыі на падкантрольных ёй тэрыторыях.

**Літаратура**


1. Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси : в 14 т. – Вильно, 1867-1904. – Т. 5. – Вильно : Печ. А.Г. Сыркина, 1871. – XVI, 256, 135 с.
2. Белорусский архив древних актов / сост. И. Григорович. – М. : Тип. С. Селивановского, 1824. – 148 с.
3. Буглаков, М. Преосвященный Георгий Конисский, Архиепископ Могилевский / М. Буглаков. – Минск : Виноград, 2000. – 656 с.
4. Вержболович, М. И. История Минской духовной семинарии : в 2 вып. / М. И. Вержболович. – Минск : Типо-литогр. Б.И. Соломонова, 1893-1896. – Вып. 1 : Дореформенный период. – 1893. – 183 с.
5. Жудро, Ф. Основание и первые годы Могилёвской духовной семинарии / Ф. Жудро // Виленский календарь на 1895 год. – Вильна: Тип. А.Г. Сыркина, 1894. – С. 175-182.
6. Истинное повествование или жизнь Г. Добрынина, им самим писанная в Могилёве и в Витебске. – СПб. : Печ. В. И. Головина, 1872. – X, 380 с.
7. Лякіна, Р. М. Гармократний Омелян / Р. М. Лякіна // Києво-Могилянська академія в іменах, XVII-XVIII ст. : Енцикл. вид. / за ред. В.С. Брюховецького. – Київ : Вид. дім «КМ Академія», 2001. – С. 135.
8. Памятники православия и русской народности в Западной России в XVII – XVIII вв. : в 1 т., 3 ч. / под ред. Ф. Титова – Киев : Тип. И. И. Чоколова, 1905. – Т. 1. – Ч. 3. – LXVII-XCVII, 1137-1771 с.
9. Полное Собрание Законов Российской Империи : Собрание первое : С 1649 по 12 декабря 1825 гг. : в 48 т. – СПб. : Тип. II Отд-ния собств. Е.И.В. канцелярии, 1830. – Т. 18 : 1767-1769. – 1830. – 1033, 7 с.
10. Полное собрание постановлений и распоряжений по ведомству православного исповедания Российской империи : собрание второе : с 25 ноября 1741 по 28 июня 1762 гг. : в 4 т. – СПб. : Синодальная тип., 1899-1912. – Т. 4 : 1753 – 28 июня 1762 гг. – 1912. – № 1580. – 619, 24 с.
11. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (РДГА). – Ф. 796. Воп. 43. Спр. 178.
12. РДГА. – Ф. 796. Воп. 68. Спр. 73.
13. Самусік, А. Ф. Кальвінскія школы на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVII – трэцяй чвэрці XVIII ст. / А. Ф. Самусік // Acta Albaruthenica : Czasopismo naukowe Uniwersytetu Warszawskiego. – 2019. – T. 19. – S. 315-327.
14. Хроника белорусского города Могилева. Собранная и писанная А. Трубницким, регентом Могилевской магдебургии, во второй половине XVIII в., а в первой половине XIX в. продолженная его сыном губернским секретарем М. Трубницким // Чтения в Обществе истории и древностей российских. – М. : Универ. тип., 1887. – Кн. 3. – С. 1-142.
15. Щеглов Г. Э. Преосв. В. Садковский, первый Минский архиепископ / Г. Э. Щеглов. – Минск : Изд-во Белорус. экзархата, 2007. – 133 с.
16. Mironowicz, A. Diecezja białoruska w latach 1697-1772 / A. Mironowicz // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2003. – №. 19. – S. 77-96.
17. Mironowicz, M. Szkoły bractw cerkiewnych na terenie Wielkiego Księstwa Litewskiego w XVI – XVIII wieku / M. Mironowicz. – Białystok : Agencja Wydawnicza EkoPress, 2019. – 557 s.


Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова